# ЯК АТРЫМАЦЬ ПАВЫШАНУЮ ПЕНСІЮ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Пры гэтым памер пенсіі па ўзросце павялічваецца на: 6, 8, 10 і 12 працэнтаў заробку, з якога вылічваецца пенсія, — адпаведна за кожны поўны першы, другі, трэці і чацвёрты гады працы, на 14 працэнтаў такога заробку — за поўны пяты і кожны наступны год працы.

1 працэнт заробку, з якога вылічваецца пенсія, — за кожныя поўныя два месяцы няпоўнага года працы. Варта таксама ўлічваць, што названыя памеры павелічэння пенсіі падсумоўваюцца паміж сабой.

Спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны растлумачылі, што пад працай без атрымання дзяржаўнай пенсіі, якая дае права на павелічэнне пенсіі, разумеюцца перыяды працы, прадпрымальніцкай, творчай і іншай дзейнасці, на працягу якіх ажыццяўлялася выплата абавязковых страхавых узносаў у бюджэт Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

## Хто мае права на павышэнне пенсіі?

Як сцвярджаюць спецыялісты Мінпрацы і сацабароны, правы на павышэнне пенсій (незалежна ад іх віду) нададзена наступным катэгорыям грамадзян:

— Героям Беларусі, Героям Савецкага Саюза, Героям Сацыялістычнай Працы, асобам, узнагароджаным ордэнамі Айчыны трох ступеняў, ордэнамі Славы трох ступеняў, ордэнамі Працоўнай Славы трох ступеняў, — на 500% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— інвалідам вайны I і II групы — на 400%, III групы — на 250% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— ваеннаслужачым, асобам начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, якія праходзілі службу ў складзе дзеючай арміі альбо прымалі ўдзел у баявых дзеяннях пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, і партызанам — на 250% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

**Мінімальны памер пенсіі па ўзросце ўстанаўліваецца ў памеры 25% найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны за два апошнія кварталы.**

— асобам з ліку вольнанаёмнага складу, якія праходзілі службу або працавалі ў складзе дзеючай арміі, — на 250% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— тым, хто прымаў удзел у складзе спецфарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах, — на 250% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— тым, хто працаваў у перыяд блакады Ленінграда на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях горада, а таксама асобам, узнагароджаным знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда», — на 100% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— былым вязням фашысцкіх канцлагераў (гета) — на 100% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— інвалідам з дзяцінства з прычыны ранення, кантузіі або калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны (або з наступствамі ваенных дзеянняў), — на 50% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— асобам, узнагароджаным ордэнамі і медалямі за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — на 50% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— бацькам і жонкам (якія не ўзялі новы шлюб) ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў, смерць якіх звязана з выкананнем службовых абавязкаў, — на 180% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— дзецям — інвалідам з дзяцінства вайскоўцаў, асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў, смерць якіх звязана з выкананнем службовых абавязкаў, а таксама бацькам, жонкам (якія не ўзялі новы шлюб) і дзецям — інвалідам з дзяцінства памерлых інвалідаў вайны — на 100% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— неабгрунтавана рэпрэсаваным у перыяд рэпрэсій 1920—1980-х гадоў, у тым ліку дзецям, якія знаходзіліся разам з бацькамі ў месцах пазбаўлення волі, у ссылцы, высылцы, на спецпасяленні, і пасля рэабілітаваным — на 50% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— донарам, узнагароджаным нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь», знакам пашаны «Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь», знакамі «Ганаровы донар СССР», «Ганаровы донар Таварыства Чырвонага Крыжа БССР», па дасягненні агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту — на 40% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце.

Інвалідам з дзяцінства, інваліднасць якім устаноўлена пажыццёва, пенсія па ўзросце павялічваецца на 50% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце.

## Надбаўкі на догляд да пенсій па ўзросце

На такія надбаўкі маюць правы:

— інваліды I групы — у памеры 100% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце;

— пенсіянеры, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту, а таксама іншыя адзінокія пенсіянеры, якія па заключэнні МРЭК або УКК маюць патрэбу ў пастаянным дапамозе староннік асоб, — на 50% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце.

Акрамя таго, да пенсій непрацуючых пенсіянераў, якія дасягнулі ўзросту 75 гадоў, устаноўлена даплата ў памеры 75% ад мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце, калі ж пенсіянеру споўнілася 80 гадоў — памер яго даплаты павялічваецца з 75% да 100% ад мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце.

КАМПЕТЭНТНА

# Павялічыць пенсію могуць і дзяржаўныя ўзнагароды

**Узнагароды або ганаровыя званні за поспехі ў працы часам могуць паслужыць падставай для атрымання дадатковай прыбаўкі да пенсіі. Але якія менавіта ўзнагароды? І з якімі дасягненнямі можна разлічваць на павышаную пенсію? Разбяромся з гэтымі пытаннямі разам са спецыялістамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

Згодна з адпаведнымі заканадаўчымі актамі, гэтая пенсія можа быць прызначана:

— Героям Беларусі, Героям Савецкага Саюза, Героям Сацыялістычнай Працы;

— грамадзянам, узнагароджаным ордэнамі Айчыны трох ступеняў, ордэнамі «За службу Радзіме» трох ступеняў, ордэнамі Славы трох ступеняў, ордэнамі Працоўнай Славы трох ступеняў, ордэнамі «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» трох ступеняў;

— грамадзянам, узнагароджаным трыма і больш ордэнамі Рэспублікі Беларусь і (або) СССР;

— жанчынам, якія нарадзілі і выхавалі дзевяць і больш дзяцей і ўзнагароджаны адной з наступных дзяржаўных узнагарод СССР ці Рэспублікі Беларусь: ордэнам Маці, медалём «Медаль мацярынства», ордэнам «Мацярынская слава», ордэнам «Маці-гераіня»;

— грамадзянам, удастоеным ганаровых званняў Рэспублікі Беларусь, БССР або СССР (народны, заслужаны);

— лаўрэатам Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь, БССР, Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР;

— грамадзянам, што займалі найвышэйшыя дзяржаўныя пасады Рэспублікі Беларусь, членам Урада Рэспублікі Беларусь, старшыням аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама — пасля спынення імі працы ў названых пасадах;

— пераможцам і прызёрам Алімпійскіх, Параалімпійскіх, Дэфлімпійскіх гульняў, чэмпіёнам свету і Еўропы.

***

Але калі вы ўваходзіце ў гэты пералік — гэта не значыць, што вам аўтаматычна гарантавана прызначэнне пенсіі за асаблівыя заслугі. Такая пенсія вызначаецца персанальна спецыяльнай камісіяй пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Прычым толькі пасля папярэдняга хадайніцтва, якое можа быць распачата рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамамі (Мінскаму гарвыканкаму), кіруючымі органамі рэспубліканскіх грамадскіх і рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў (саюзаў) з улікам меркавання працоўнага калектыву, у якім вы працавалі.

Да хадайніцтва прыкладаюцца заява, дакументы, якія пацвярджаюць асаблівыя заслугі, уліковы лісток з аддзела кадраў, аўтабіяграфія, характарыстыка, даведка аб памеры пенсіі.

Пенсія за асаблівыя заслугі ўстанаўліваецца ў памеры пенсіі па ўзросце, па інваліднасці або за выслугу гадоў, прызначанай у адпаведнасці з пенсійным заканадаўствам або заканадаўствам аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь, і павышэння за асаблівыя заслугі.

Канкрэтныя памеры павышэння вызначае Камісія па прызначэнні пенсіі за асаблівыя заслугі. Пры гэтым памер павышэння за асаблівыя заслугі не можа перавышаць 250% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце.

Памер пенсіі за асаблівыя заслугі можа быць перагледжаны Камісіяй у частцы павелічэння памеру павышэння за асаблівыя заслугі пры з'яўленні новых (дадатковых) звестак аб асаблівых заслугах грамадзяніна, а таксама пры ўзнагароджанні грамадзяніна ордэнам ці медалём Рэспублікі Беларусь (за выключэннем юбілейнага).

Пры гэтым варта мець на ўвазе, што пенсія за асаблівыя заслугі не ўстанаўліваецца лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола, кавалерам ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, грамадзянам, якія маюць медалі, ганаровыя граматы Вярхоўнага Савета ці Савета Міністраў.

Акрамя таго, правы на такую пенсію не маюць тыя, у каго ёсць судзімасць.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

Прыемная навіна

# СОНЕЧНЫ ДОМ



Фота БЕЛТА

**Сімвалічны ключ ад новага пяціпавярховага жылога дома на 40 кватэр уручыў кіраўніку Любанскага раёна Сяргею Казецкаму старшыня савета дырэктараў замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Слаўкалій» Міхаіл Гуцэрыеў. Гэта асабісты падарунак бізнесмена, мецэната горада. Узвялі будынак за рэкордна сціслыя тэрміны — менш як за год. Забудоўшчык — падкантрольная Міхаілу Гуцэрыеву кампанія «СертусАвія».**

У доме толькі двух- і трохпакаёвыя кватэры, аснашчаныя сантэхнікай, кухоннымі плітамі. Выдзяляцца яны будуць тым, хто стаіць у чарзе і мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Пяціпавярховік у Любані ўжо назвалі сонечным, паколькі фасад аздоблены цёплымі жоўтымі фарбамі. А ключ ад гэтага дома, лічаць любчане, сімвалізуе новы этап развіцця райцэнтра, які пачаўся з таго моманту, калі ў верасні 2015 года Прэзідэнт Беларусі і расійскі бізнесмен заклалі капсулу ў знак пачатку будаўніцтва Нежынскага горна-абагачальнага камбіната на месцы Старобінскага радовішча калійнай руды.

— Два гады таму мы паабяцалі Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку пабудаваць дом. Ён узведзены не на народныя, а на асабістыя грошы. Гэта не першы падарунак гораду. Мы пабудуем яшчэ шмат такіх дамоў, — адзначыў Міхаіл Гуцэрыеў. — Мясцовыя людзі, тыя, хто прыедзе працаваць на новы камбінат з іншых рэгіёнаў, павінны жыць у добрых умовах. У межах праекта па будаўніцтве горна-абагачальнага камбіната плануецца ўзвесці яшчэ пяць жылых дамоў. Але на савецe дырэктараў мы прынялі рашэнне пабудаваць дадаткова яшчэ пяць шматкватэрных дамоў, якія бясплатна перададзім ва ўласнасць горада. Тут будуць прадугледжаны ўся неабходная інфраструктура, дзіцячыя пляцоўкі.

Міхаіл Гуцэрыеў наведаў таксама пляцоўку пад будаўніцтва вытворчасці.

— Гэта праект XXI стагоддзя з выкарыстаннем найноўшых сусветных тэхналогій. Яго агульны кошт два мільёны долараў: наша кампанія ўкладзе 600 млн долараў, Кітай дасць крэдыт у 1,5 млрд долараў, — расказаў бізнесмен. — Будаўніцтва камбіната пачалі ў 2016 годзе і разлічваем закончыць да 2020 года. Магутнасць прадпрыемства — 2 млн тон калійных угнаенняў штогод, тут будзе створана больш як тысяча працоўных месцаў. Пасля ўвядзення камбіната ў дзеянне канкурэнцыі «Беларуськалію» па цэнах не прадбачыцца. Канкурэнцыя магчымая толькі па якасці, выпрацоўцы. Будзем разам выходзіць на сусветны рынак праз Беларускую калійную кампанію.

Як адзначыў дырэктар «Слаўкалія» Ігар Коржыч, усе работы ідуць планава, адпаведна з графікам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*


## Результаты рекламной игры «АЛЬФРЭД ЗОВЕТ В INSYNC.BY»

Организатор рекламной игры – Общество с ограниченной ответственностью «Агентство событийных проектов «Альтер Эго Групп», 220005, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 58-401. УНП 192207643.

Рекламная игра «Альфрэд зовет в INSYNC.BY» проводилась на территории Республики Беларусь. Срок начала рекламной игры – 30 октября 2017 года, срок окончания – 8 декабря 2017 года.

Свидетельство о государственной регистрации №3121, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 24 октября 2017 года.

В рекламной игре участвовали 14 760 человек. Призовой фонд разыгран полностью.

**Список победителей рекламной игры**

| | Победитель | Приз |
|---|---|---|
| 1 | Богушевич Д. И. | Сотовый телефон Samsung Galaxy S8 DS 64GB SM-G950FD с товарным знаком (знаком обслуживания) ЗАО «Альфа-Банк» и денежные средства в размере 252 рублей |
| 2 | Мухин Д. В. | Сотовый телефон Samsung Galaxy S8 DS 64GB SM-G950FD с товарным знаком (знаком обслуживания) ЗАО «Альфа-Банк» и денежные средства в размере 252 рублей |
| 3 | Балалаева И. А. | Сотовый телефон Samsung Galaxy S8 DS 64GB SM-G950FD с товарным знаком (знаком обслуживания) ЗАО «Альфа-Банк» и денежные средства в размере 252 рублей |
| 4 | Концевой Н. В. | Сотовый телефон Samsung Galaxy S8 DS 64GB SM-G950FD с товарным знаком (знаком обслуживания) ЗАО «Альфа-Банк» и денежные средства в размере 252 рублей |

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры 8 (029) 252-74-39